WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 САКАВІКА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 58—59
(26666—26667)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў абмеркавалі па тэлефоне магчымасць правядзення ў найбліжэйшы час сустрэчы

**Учора адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў шчырыя спачуванні кіраўніцтву Расіі, усяму расійскаму народу ў сувязі са страшэнным тэрарыстычным актам у маскоўскім метро, які прывёў да шматлікіх чалавечых ахвяр.

У ходзе размовы лідары дзвюх краін закранулі шэраг пытанняў беларуска-расійскіх адносінаў. Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў абмеркавалі магчымасць правядзення ў бліжэйшы час сустрэчы, на парадак дня якой можна было б вынесці ўвесь спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. У сувязі з гэтым кіраўнікам прэзідэнцкіх адміністрацый дадзены адпаведныя даручэнні па падрыхтоўцы гэтай сустрэчы на вышэйшым узроўні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «ЧОРНЫ ПАНЯДЗЕЛАК» У МАСКВЕ

### *У маскоўскім метро ўчыненыя два тэрарыстычныя акты*

**Выбухі з розніцай у 45 хвілін прагрымелі на дзвюх станцыях Сакольніцкай лініі метрапалітэна — на «Лубянцы» і «Парку культуры». Прычым, для тэрарыстычных актаў бандыты выбралі час пік, калі большасць людзей ехалі на працу: першы выбух адбыўся ў 7.52 па маскоўскім часе ў другім вагоне падчас пасадкі-высадкі пасажыраў на «Лубянцы», другое выбуховае прыстасаванне спрацавала ў 8.37.**



Да абедзвюх станцый тэрмінова прыбылі больш як 70 брыгад хуткай медыцынскай дапамогі, супрацоўнікі міліцыі і міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Улічваючы, што з-за надзвычайных здарэнняў у цэнтры Масквы быў літаральна паралізаваны рух машын, для эвакуацыі параненых выкарыстоўваліся нават верталёты МНС. Паводле папярэдніх звестак, каля 400 чалавек і 180 адзінак тэхнікі бралі ўдзел у выратавальных работах.

На жаль, у выніку ўчыненых тэрарыстычных актаў ёсць як загінулыя, так і пацярпелыя. Паводле звестак, што былі на момант выхаду газеты, колькасць загінулых на дзвюх станцыях склала 38 чалавек, а раненні атрымалі каля 100 чалавек, пры гэтым каля трэці пацярпелых атрымалі нязначныя раненні, якія не патрабавалі шпіталізацыі, а вось 8 чалавек знаходзіліся ў крайне цяжкім стане, 25 — у цяжкім і 26 — у стане сярэдняй ступені цяжкасці. Між іншым, ахвяраў магло быць нашмат больш, бо следчыя знайшлі на месцы другога выбуху яшчэ адзін «пояс шахіда», які не разарваўся.

Як вынікае з папярэдняй інфармацыі, выбухі адбыліся пры актывізацыі так званых «паясоў шахідаў» дзвюма тэрарысткамі-смяротніцамі, астанкі целаў якіх знойдзеныя. Акрамя таго, у вышуку знаходзяцца яшчэ дзве жанчыны, якія, як мяркуецца, суправаджалі тэрарыстак да ўваходу ў метро: пра гэта стала вядома, калі эксперты вывучылі звесткі з відэакамер. Папярэднія высновы выбухатэхнічнай экспертызы сведчаць, што выбуховым рэчывам быў гексаген, у першым выпадку магутнасцю да 4 кілаграмаў, у другім — ад 1,5 да 2 кілаграмаў, элементамі паражэння сталі насечаная арматура і балты.

Паводле адной з версій, якія разглядаюцца следствам, гэтыя выбухі маглі стаць помстай тэрарыстаў за паспяховыя аперацыі расійскіх сілавікоў на Паўночным Каўказе. У прыватнасці, сярод ліквідаваных баевікоў былі такія лідары тэрарыстаў, як Саід Бурацкі, Анзор Асцеміраў, Саламбек Ахмадаў, Абу Халед. У Інгушэціі была ліквідаваная цэлая група тэрарыстычнага падполля.

СТАР. 2



Фота www.bigpicture.ru

## Навучэнцы — «заложнікі» вострава

**Два навучэнцы ў Мёрскім раёне сталі заложнікамі вострава на рацэ Заходняя Дзвіна.**

Як паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО,** падчас ледаходу хлопцы па крыгах трапілі на востраў ля горада Дзісна. Самастойна выбрацца з палону між льдоў не маглі. Выратавальнікі даставілі хлопцаў на катары на вялікую зямлю. Стан іх здароўя быў здавальняючы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Актуальнае інтэрв'ю

# «ВА ЎЛАДЫ ЁСЦЬ АБ'ЕКТЫЎНАЕ БАЧАННЕ ПРАБЛЕМ, ШТО ХВАЛЮЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ, І РАЗУМЕННЕ МЕХАНІЗМАЎ ІХ ВЫРАШЭННЯ»

*Напярэдадні вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА даў інтэрв'ю «Звяздзе»*



Фота БЕЛТА.

**— 2 красавіка эпіцэнтр заканатворчай работы парламента зноў перамесціцца з пастаянных камісій у Авальную залу. Уладзімір Паўлавіч, дэпутаты ўжо ведаюць, як будуць галасаваць — «за» ці «супраць» — па законапраектах, уключаных у прыкладную праграму сесіі?**

— Думаю, што пэўная пазіцыя ўжо сфарміравалася. Ва ўсякім разе па тых законапраектах, якія ў міжсесійны перыяд прайшлі ўсю працэдуру экспертызы, дапрацоўкі і ўзгаднення і па якіх ужо ёсць неабходныя заключэнні.

**— А колькі дакументаў прапанавана профільнымі камісіямі ў праект парадку дня сесіі?**

— Больш за трыццаць. Па ходу сесійнай работы іх колькасць будзе павялічвацца. Мы працягваем работу над шэрагам іншых дакументаў, якія паступілі ў Палату прадстаўнікоў і знаходзяцца на заключным этапе падрыхтоўкі.

СТАР. 7

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 красавіка 2010 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.03.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 990,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 031,72 |
| 1 латвійскі лат | 5 693,61 |
| 1 літоўскі літ | 1 168,15 |
| 1 чэшская крона | 158,94 |
| 1 польскі злоты | 1 037,20 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 100,91 |
| 1 украінская грыўня | 377,41 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 29,6309 |
| 10 UAH | 37,3891 |
| 1000 BYR | 9,8935 |
| EUR | 39,8654 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

белагропромбанк
традиции будущего

# ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

Форма 1 годового отчета

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 | 284 714,2 | 230 441,2 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 10 | 109 600,5 | 253 710,1 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 11,42 | 472 872,0 | 1 383 898,9 |
| | для торговли | 11031 | | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | | 5,8 | 4,4 |
| | в наличии для продажи | 11033 | | 472 866,2 | 1 383 894,5 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 12 | 83 554,7 | 193 140,3 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 13,42 | 18 049 583,0 | 12 914 974,4 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 14 | 128 530,4 | 16 905,6 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 15,42 | 486 329,7 | 409 350,8 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 16 | 79 858,2 | 60 480,6 |
| **10** | **ИТОГО активы** | **110** | | **19 695 042,7** | **15 462 901,9** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 17 | 2 554 477,1 | 1 013 053,3 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 18 | 3 658 411,1 | 1 871 553,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 19,42 | 8 563 312,4 | 7 900 324,7 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 20 | 194 308,4 | 198 237,9 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 21,42 | 174 791,9 | 117 711,1 |
| **17** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **15 145 300,9** | **11 100 880,6** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 22 | 3 878 635,0 | 3 828 633,5 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 23 | 85 500,1 | 41 861,8 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 24 | 344 350,4 | 265 021,9 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 25 | 241 256,3 | 226 504,1 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 4 549 741,8 | 4 362 021,3 |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **19 695 042,7** | **15 462 901,9** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | | 21 264 120,0 | 11 862 864,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | | 1 335 128,4 | 2 568 730,8 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2009 год

Форма 2 годового отчета

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 27,42 | 2 165 374,2 | 1 015 399,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 27,42 | 1 444 004,9 | 721 831,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 27 | 721 369,3 | 293 568,7 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 28,42 | 235 433,7 | 190 438,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 28,42 | 34 526,9 | 19 369,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 28 | 200 906,8 | 171 068,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 29,42 | (-109 873,6) | 94 107,7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 30,42 | (-378,8) | 767,8 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 31,42 | 145,2 | 280,6 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 32,42 | 376 125,9 | 78 864,9 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 33,42 | 237 929,0 | 32 659,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 34,42 | 401 612,9 | 303 726,0 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 35,42 | 61 894,0 | 59 054,4 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 36 | 80 911,1 | 41 959,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 26 | 129 554,0 | 108 848,0 |
| | Базовая прибыль на простую акцию (в рублях) | | 37 | 67,46 | 106,65 |
| | Разводненная прибыль на простую акцию | | 38 | - | - |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2009 год

Форма 3 годового отчета

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2008 г. | 3011 | 1878635,0 | - | 30725,9 | 172449,9 | 176180,9 | 2257991,7 |
| 2 | Изменения статей капитала, в том числе: | 3012 | 1949998,5 | - | 11135,9 | 92572,0 | 50323,2 | 2104029,6 |
| 2.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 108848,0 | 50316,8 | 159164,8 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 11135,9 | (-11135,9) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 1949998,5 | - | x | (-63,0) | x | 1949935,5 |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 1950000,0 | - | x | x | x | 1950000,0 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (-63,0) | x | (-63,0) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | (-1,5) | x | x | x | x | (-1,5) |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (-5077,1) | 6,4 | -5070,7 |
| 3 | Остаток на 1 января 2009 г. | 3013 | 3828633,5 | - | 41861,8 | 265021,9 | 226504,1 | 4362021,3 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2009 г. | 3011 | 3828633,5 | - | 41861,8 | 265021,9 | 226504,1 | 4362021,3 |
| 5 | Изменения статей капитала, в том числе: | 3012 | 50001,5 | - | 43638,3 | 79328,5 | 14752,2 | 187720,5 |
| 5.1 | совокупный доход | 30121 | x | x | x | 129554,0 | 14752,2 | 144306,2 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 43638,3 | (-43638,3) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 50001,5 | - | x | (-1766,8) | x | 48234,7 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 50000,0 | - | x | x | x | 50000,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (-1766,8) | x | (-1766,8) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 1,5 | x | x | x | x | 1,5 |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (-4820,4) | - | (-4820,4) |
| 6 | Остаток на 1 января 2010 г. | 3013 | 3878635,0 | - | 85500,1 | 344350,4 | 241256,3 | 4549741,8 |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2009 год

Приложение к отчету об изменении капитала

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | | 129554,0 | 108848,0 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период, в том числе: | 301212 | | 14752,2 | 50316,8 |
| 2.1 | переоценка основных средств | 3012121 | | 14208,1 | 48988,4 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 544,1 | 1328,4 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | | 144306,2 | 159164,8 |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2009 год

Форма 4 годового отчета

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **Потоки денежных средств от операционной деятельности** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 7010 | | 2 165 374,2 | 1 015 398,5 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 7011 | | -1 437 545,6 | -705 811,1 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 7012 | | 235 453,7 | 190 447,8 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 7013 | | -34 194,8 | -18 998,4 |
| 6 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 7014 | | 82 204,5 | 119 673,1 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 7015 | | -378,8 | 767,8 |
| 8 | Доход в форме дивидендов | 7016 | | 145,2 | 280,6 |
| 9 | Прочие полученные доходы | 7017 | | 236 469,1 | 32 176,3 |
| 10 | Прочие уплаченные расходы | 7018 | | -414 972,8 | -340 769,2 |
| 11 | Уплаченный налог на прибыль | 7019 | | -86 576,4 | -50 465,9 |
| 12 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах | 701 | | 745 978,3 | 242 699,5 |
| 13 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 7020 | | 69 919,8 | -94 923,6 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 7021 | | 908 486,6 | -839 986,2 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках | 7022 | | 45 018,3 | -42 522,5 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 7023 | | -4 935 183,1 | -6 121 733,6 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 7025 | | 30 782,6 | -53 521,2 |
| 18 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | -3 880 975,8 | -7 152 687,1 |
| 19 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 7030 | | 1 541 731,9 | 461 184,9 |
| 20 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков | 7032 | | 1 431 784,9 | 580 274,3 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 7033 | | 258 420,1 | 3 983 946,5 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 7034 | | -16 955,8 | 102 667,9 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 7035 | | -56 070,3 | 48 134,3 |
| 24 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | 3 158 910,8 | 5 176 207,9 |
| 25 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | 23 913,3 | -1 733 779,7 |
| **26** | **Потоки денежных средств от инвестиционной деятельности** | | | | |
| 27 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 7110 | | -97 198,4 | -90 901,9 |
| 28 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 7111 | | -4 913,6 | -900,8 |
| 29 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 7112 | | -108 670,0 | -11 733,3 |
| 30 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 7113 | | - | - |
| 31 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7114 | | -41,8 | -23,5 |
| 32 | Погашение (реализация ) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 7115 | | 32,2 | 32,2 |
| 33 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | -210 791,6 | -103 527,3 |
| **34** | **Потоки денежных средств от финансовой деятельности** | | | | |
| 35 | Эмиссия акций | 7211 | | 50 000,0 | 1 950 000,0 |
| 36 | Выкуп собственных акций | 7212 | | - | -1,5 |
| 37 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 7213 | | 1,5 | - |
| 38 | Выплата дивидендов | 7214 | | -1 766,8 | -61,9 |
| 39 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 48 234,7 | 1 949 936,6 |
| 40 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 55 332,4 | 6 067,8 |
| 41 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | 40 | -83 311,2 | 118 697,4 |
| 42 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 400 387,2 |
| 43 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 41 | 317 076,0 | x |

Председатель Правления С.Н.Румас

Главный бухгалтер М.А.Шаповалова

Дата подписания «4» марта 2010 г.

Достоверность годового отчета подтверждена.

Директор ОДО «Владаудит» В.Д.Михаленя

«12» марта 2010 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

## Общество с дополнительной ответственностью «Владаудит»

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 21 сентября 2000 г. № 1081, УНП 190147255
220005, г. Минск, ул. Смолячкова, 9-302

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ № 1-4/43

### по бухгалтерской (финансовой) отчетности открытого акционерного общества «Белагропромбанк» за период с 1 января по 31 декабря 2009 года

г. Минск 12 марта 2010 г.

Председателю Правления
ОАО «Белагропромбанк»
Румасу С.Н.

Мы, аудиторская организация – общество с дополнительной ответственностью «Владаудит» ***(специальные разрешения (лицензии), выданные: Министерством финансов Республики Беларусь – № 02200/0495306, срок действия – 15.02.2009–15.02.2014 (решение № 432 от 19.12.2008) и Национального банка Республики Беларусь – № 8, срок действия – 14.11.2005–14.11.2010 (решение № 11 от 14.11.2005)),*** провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности открытого акционерного общества «Белагропромбанк» (далее – Банк) **(220036, г. Минск, пр. Жукова, 3, зарегистрировано решением Национального банка Республики Беларусь от 3 сентября 1991 г., № 20, УНП 100693551),** состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 1 января 2010 года, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств, пояснительной записки за 2009 год, а также форм пруденциальной отчетности: 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» и 2809 «Расчет ликвидности».

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством, нормативными актами, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности банками Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде, а также за соответствие совершенных финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных Банком банковских операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», Инструкции о регулировании аудиторской деятельности в банках, небанковских, кредитно-финансовых организациях, банковских группах и банковских холдингах, утвержденной Национальным банком Республики Беларусь, правил аудиторской деятельности, утвержденных Министерством финансов Республики Беларусь, правил аудиторской деятельности ОДО « Владаудит», которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации о бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а также с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования самой системы внутреннего контроля.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления о бухгалтерской (финансовой) отчетности, соблюдения нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение открытого акционерного общества «Белагропромбанк» на 1 января 2010 года, результаты его деятельности и движение денежных средств за 2009 год, сформирована в соответствии с требованиями законодательства, нормативных актов, регулирующих порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности банками Республики Беларусь, при этом совершенные банковские операции соответствуют действующему законодательству.

Не делая оговорок, мы обращаем внимание на несоблюдение Банком в течение 2009 года отдельных нормативов безопасного функционирования. По состоянию на 1 января 2010 года Банком соблюдены нормативы безопасного функционирования, установленные Национальным банком Республики Беларусь. Организованная система внутреннего контроля обеспечивает надлежащий уровень надежности, соответствующий характеру и объемам осуществляемых банковских операций.

Нами подтверждена достоверность информации, включенной в формы пруденциальной отчетности: 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» и 2809 «Расчет ликвидности» по состоянию на 1 января 2010 года, и составленной Банком в соответствии с требованиями Национального банка Республики Беларусь.

Директор В.Д. Михаленя

Руководитель группы аудиторов С.Н. Протащик

Пётр ПРАКАПОВІЧ:

# «НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ ПАВІННА СПАКОЙНА СТАВІЦЦА ДА НЯЗНАЧНЫХ ВАГАННЯЎ КУРСАЎ ВАЛЮТ»

Такую думку выказаў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч падчас справаздачы Прэзідэнту Беларусі.

Як далажыў Пётр Пракаповіч, курс беларускага рубля да кошыка валют па выніках двух месяцаў 2010 года застаецца стабільным, прагназуемым і поўнасцю адпавядае Асноўным напрамкам грашова-крэдытнай палітыкі. За гэты перыяд курс беларускага рубля да кошыка замежных валют скараціўся на 0,7 працэнта (пры намечаным калідоры +/- 10 працэнтаў). Што датычыцца ваганняў унутры кошыка, то, як растлумачыў кіраўнік Нацбанка, гэта залежыць ад ваганняў валют, якія ўваходзяць у склад кошыка, а менавіта долара, еўра і расійскага рубля. «На жаль, гэтыя валюты непрадказальныя, ваганні іх значныя, у асобныя дні бываюць нават каля 1 працэнта. Ідзе пастаяннае ваганне долара да еўра, долара да расійскага рубля. Пры гэтым, зразумела, гэтыя ваганні адбіваюцца і ў нас у рэспубліцы». Ён таксама нагадаў, што апошнім часам назіраліся працэсы ўмацавання долара і аслаблення еўра. На думку старшыні праўлення Нацбанка, складана спрагназаваць гэтыя працэсы ў далейшым, аднак, улічваючы пастаяннае змяненне сітуацыі, можна чакаць умацавання еўра. Пётр Пракаповіч лічыць, што грамадзяне краіны павінны да гэтых працэсаў ставіцца спакойна. «Галоўнае — у нас няма ваганняў беларускага рубля да кошыка валют, і тое, што мы абяцалі ў пачатку года захаваць ваганні ў межах калідора +/- 10 працэнтаў і не выйсці за яго межы, мы выканаем. Ёсць усе магчымасці да канца года ўмацаваць нацыянальную валюту. Таму насельніцтва павінна спакойна ставіцца да тых нязначных ваганняў, якія назіраюцца сёння на рынку валют», — падкрэсліў кіраўнік Нацбанка.

Нацыянальны банк Беларусі рэкамендуе банкам да канца I паўгоддзя знізіць працэнтныя стаўкі па крэдытах да велічыні «стаўка рэфінансавання плюс 3 працэнты». Пётр Пракаповіч адзначыў, што працэнтныя стаўкі па крэдытах у студзені-лютым заставаліся даволі высокімі, але ў далейшым будуць паступова зніжацца. Ён таксама запэўніў, што гэта работа ў бліжэйшыя тры месяцы будзе завершана, і выказаў упэўненасць, што ўсе банкі выканаюць гэту рэкамендацыю ў поўным аб'ёме. Як было далажана кіраўніку дзяржавы, Нацбанк працуе над тым, каб забяспечыць поўнае крэдытаванне эканомікі ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі. Так, па стану на 1 сакавіка 2010 года крэдытаванне рэальнага сектара эканомікі павялічылася на 29 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года пры прагнозных паказчыках 36-40 працэнтаў. Пётр Пракаповіч лічыць, што па выніках работы за першае паўгоддзе гэтыя прагнозныя паказчыкі будуць выкананы. Нарошчваецца таксама рэсурсная база банкаў. Што датычыцца крэдытавання жылля, то з пачатку года ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года, ільготнае крэдытаванне жылля павялічылася амаль у 1,6 раза.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АСАБЛІВЫЯ НАДЗЕІ ПА НАРМАЛІЗАЦЫІ АДНОСІНАЎ ЗВЯЗВАЕ З НОВАЙ АДМІНІСТРАЦЫЯЙ ЗША

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вітае стварэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і ЗША. Аб гэтым ён заявіў на сустрэчы з кіраўніцтвам шэрагу буйных амерыканскіх кампаній.**

З ініцыятывай аб'яднаць бізнэсменаў дзвюх краін, зацікаўленых у развіцці гандлёва-эканамічных і інвестыцыйных сувязяў паміж дзяржавамі, выступіў амерыканскі бок. Прэзідэнт выказаў надзею, што буйны амерыканскі бізнэс, прыйшоўшы ў Беларусь і аб'ектыўна ацаніўшы перспектывы і выгады супрацоўніцтва, зможа аказаць станоўчы ўплыў на нармалізацыю двухбаковых адносінаў. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, прыезд у Мінск кіраўнікоў амерыканскіх карпарацый і кампаній — сусветных лідараў у такіх перадавых галінах, як машынабудаванне, інфармацыйныя тэхналогіі, інвестыцыйны і юрыдычны кансалтынг, адкрые новую старонку ў гісторыі беларуска-амерыканскіх адносінаў. Аляксандр Лукашэнка лічыць важным імкненне амерыканскага боку супрацоўнічаць у сферы знешняга гандлю і інвестыцый, быць сувязным звяном паміж двума народамі. Ён падкрэсліў, што для гэтага ў Беларусі ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы. «Акрамя сацыяльна-палітычнай стабільнасці і забеспячэння высокіх тэмпаў развіцця эканомікі, намі прыняты беспрэцэдэнтныя меры па лібералізацыі і ўдасканаленні ўсіх працэдур, звязаных з вядзеннем бізнэсу...»

Прэзідэнт нагадаў, што ў Беларусі пастаўлена задача вывесці краіну ў першую трыццатку дзяржаў у сусветным рэйтынгу па ўмовах вядзення бізнэсу. Вынікі гэтай работы ўжо атрымалі добрую ацэнку з боку Сусветнага банка і іншых аўтарытэтных міжнародных арганізацый.

Беларусь гатова пакінуць усе крыўды ў мінулым і пачаць плённае супрацоўніцтва з ЗША не толькі ў эканамічнай, але і ў іншых сферах. Аляксандр Лукашэнка асаблівыя надзеі на нармалізацыю адносінаў звязвае з новай адміністрацыяй ЗША. «Я схільны лічыць, што ў Прэзідэнта Абамы погляд на свет больш адэкватны і дэмакратычны, не абцяжараны перажыткамі халоднай вайны і агрэсіўнымі ідэалагічнымі падыходамі да вырашэння міжнародных пытанняў». Аляксандр Лукашэнка расказаў, што яму вельмі імпануе заява Барака Абамы з трыбуны ААН: «Мы больш не можам дазволіць сабе патураць нашым рознагалоссям... Мы павінны ўвайсці ў новую эпоху адносінаў, заснаваных на ўзаемных інтарэсах і ўзаемнай павазе». Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што гэты падыход поўнасцю сугучны з прынцыпамі міждзяржаўнага супрацоўніцтва, якімі кіруецца Беларусь. «З цяперашняй адміністрацыяй мы пачалі ўжо асцярожную размову і гатовы працягнуць руку дружбы амерыканскім партнёрам», — заявіў беларускі лідар. Аднак Прэзідэнт Беларусі выказаў сумненні ў магчымасці цывілізаванага, сапраўды эфектыўнага дыялога і ўзаемадзеяння ва ўмовах, калі адзін з бакоў знаходзіцца пад адкрытым націскам. «Наша краіна зацікаўлена ў развіцці паўнацэнных узаемавыгадных канструктыўных адносінаў з адной з самых магутных дзяржаў свету. Але яны павінны грунтавацца на прынцыпах неўмяшання ва ўнутраныя справы другой дзяржавы, узаемнай павазе і даверы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка выказаў шкадаванне, што ў апошнія дзесяцігоддзі адносіны Беларусі і ЗША развіваліся вельмі нераўнамерна і «часта знаходзіліся ў стане прыкрай адчужанасці». «Прычым, хачу падкрэсліць, — не па віне Беларусі». На думку Прэзідэнта, тыя кропкавыя эканамічныя санкцыі, якія прымяніла да асобных беларускіх прадпрыемстваў адміністрацыя Джорджа Буша-малодшага, да гэтага часу ствараюць негатыўны фон для развіцця ўсяго комплексу гандлёва-эканамічных сувязяў паміж дзвюма дзяржавамі. «На маю думку, не варта такой дзяржаве, як ЗША, прыбягаць да адкрытага эканамічнага шантажу суверэннай дзяржавы, якая яшчэ толькі фарміруецца».

У Беларусі і ЗША ёсць унікальная магчымасць для паляпшэння адносінаў паміж дзяржавамі і народамі. Такую думку выказаў партнёр юрыдычнай кампаніі «Грынберг Траўрыг» Дэвід Бэйран. «Мы тут знаходзімся не для таго, каб абмяркоўваць палітычныя пытанні, а з тым, каб гаварыць аб эканоміцы. Але мы шчыра думаем, што гэта ўнікальная магчымасць, каб палепшыць адносіны паміж нашымі краінамі і народамі».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка гарантуе амерыканскаму бізнэсу, які прыйдзе ў Беларусь, падтрымку з боку ўладаў і спрыяльныя ўмовы для работы. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што амерыканскія бізнэсмены пры жаданні змогуць істотна дапамагчы ў нармалізацыі міждзяржаўных адносінаў. «Гэта ненармальна, калі дзве цывілізаваныя дзяржавы, якія калісьці ваявалі разам супраць фашызму, сёння знаходзяцца па розныя бакі барыкад і глядзяць скоса адна на адну». Прэзідэнт лічыць, што для бізнэсменаў ЗША ў Беларусі ёсць вялікае поле для дзейнасці: пачынаючы ад будаўніцтва авіязаводаў, узлётна-пасадачных палос да стварэння ядра «Мінск-Сіці», будаўніцтва атамнай станцыі.

«Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. І калі вы зацікаўлены ў гэтым рынку, вам будуць створаны самыя спрыяльныя ўмовы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Звяртаючыся да кіраўнікоў буйных амерыканскіх кампаній, кіраўнік дзяржавы папрасіў іх зыходзіць з таго, што Беларусь «не знаходзіцца ў нейкім катастрафічным крызісе і не апусцілася на дно ямы». Ён прызнаў, што сусветны фінансава-эканамічны крызіс аказвае некаторы ўплыў на сітуацыю ў Беларусі, але эканоміка краіны можа пракарміць 10 млн чалавек насельніцтва. «У нас няма крытычнай сітуацыі. І ў сувязі з гэтым мы не кідаемся на любую прапанову. Але будзем яе вельмі сур'ёзна вывучаць. Пры гэтым вывучаць вельмі хутка — без усялякіх затрымак і карупцыйных і крымінальных праяў».

Аляксандр Лукашэнка чарговы раз звярнуў увагу, што сутнасць бягучай сустрэчы ў тым, каб і беларускі народ, і людзі ў іншых дзяржавах ўбачылі і зразумелі, што Прэзідэнт краіны за тое, каб замежны бізнэс прыходзіў у Беларусь. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што прыход буйных амерыканскіх карпарацый у Беларусь — гэта новыя тэхналогіі, школы, прагрэс у развіцці эканомікі...

«Адзіная ўмова: не ідзіце да нас, як у трэцярадную краіну. Не думайце, што мы маларазвітая дзяржава, якая нічога не разумее. Мы адукаваныя людзі, — звярнуўся Прэзідэнт да амерыканскіх бізнэсменаў. — Ідзіце да нас, як да сябе ў краіну: з павагай да народа, успрыманнем усяго таго, што тут існуе». Ён таксама дадаў: «Я не заклікаю мірыцца вас з тымі недахопамі, якія ёсць. Калі вы будзеце нам на іх указваць, мы добрыя вучні, мы таксама будзем у вас вучыцца. Але рабіце гэта дастойна, карэктна, і мы вам за ўсё гэта будзем удзячныя».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## Абзац

◢ У Петрыкаўскім раёне адрэзанымі ад сухапутных зносінаў апынуліся 4 вёскі. У выніку росту ўзроўню вады ў Прыпяці былі адрэзаныя вёскі Снядзін, Мардвін, Белін і Таргашын, у якіх жыве 300 чалавек. Яшчэ раніцай у вёскі можна было праехаць па дарозе, аднак у другой палове дня вада размыла дарогі. Арганізавана пастаяннае дзяжурства катараў МНС, якія дастаўляюць у вёскі прадукты харчавання, а таксама ўсё, што неабходна жыхарам. У населеных пунктах ёсць ФАП, пошта, школа.

**◢ Каля 5 тон мацы напярэдадні Песаха даставілі ў Беларусь з Ізраіля. Беларускія іудзеі рыхтуюцца адзначыць адно з галоўных святаў рэлігійнага календара.**

◢ Жыхар Гродна затрыманы пры спробе сплавіць па Нёмане ў Літву 10 тыс. пачкаў цыгарэт. Плыт з герметычна спакаванымі цыгарэтамі «Прэм'ер» з акцызнымі маркамі Беларусі быў выяўлены гродзенскімі міліцыянерамі і памежнікамі ноччу паблізу населенага пункта Прывалка. Ён плыў па Нёмане. Тытунёвыя вырабы на суму Br12 млн канфіскаваныя.

**◢ Выратавальнікі дасталі з Чыжоўскага вадасховішча цела патанулага рыбака. Устанаўліваецца яго асоба.**

◢ Крызіс ударыў па кішэнях масквічоў, і многія з іх, каб выжыць, сталі здаваць у арэнду кухні і балконы сваіх кватэр. З мэтай атрымання дадатковага заробку жыхары сталіцы прапануюць нават кладоўкі ў кватэрах. Выраслі і прапановы сутачнай і пагадзіннай арэнды памяшканняў.

## Поўны абзац

**◢ У Ванкуверы пачаўся распродаж абсталявання, адзення, расходных матэрыялаў, якія засталіся ў арганізатараў пасля правядзення Алімпійскіх гульняў і Паралімпіяды. У прыгарадзе Ванкувера ў памяшканні склада выстаўлены тэлевізары з плоскім экранам, скураныя канапы, мэбля, офіснае абсталяванне, тавары з алімпійскай сімволікай. За $5 можна купіць скрынку набытага для Гульняў штучнага снегу, а за $12 — рыдлёўку для яго раскідвання.**

◢ У невялікую булачную, размешчаную ў Джорджыі (ЗША), замест замоўленых дэталяў даставілі 272 кг марыхуаны. Днямі булачная праз службу дастаўкі замовіла, акрамя неабходных для вытворчасці інгрэдыентаў (мукі, цукру і г.д.), пакет запчастак для рамонту пагрузачнай платформы. Атрымаўшы яго, заказчыкі знайшлі там замест дэталяў марыхуану. Супрацоўнікі булачнай неадкладна звязаліся з паліцыяй. Паводле папярэдніх звестак праваахоўнікаў, пасылка была прывезеная службай дастаўкі з прыватнага склада. Яе адпраўшчыкі пакуль не выяўлены. Па факце здарэння заведзена крымінальная справа, ніводзін з булачнікаў не быў затрыманы.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ КОМИССИИ ПО РАБОТЕ С ИМУЩЕСТВОМ, ОБРАЩЕННЫМ В ДОХОД ГОСУДАРСТВА, ПРИ БОРИСОВСКОМ РАЙИСПОЛКОМЕ**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже склада ядохимикатов, об. пл. 418 кв. м, расположенного по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, д. Лошница. Начальная цена (снижена на 20 %) – 39 858 730 бел. рублей. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.02.2010. Аукцион состоится **15.04.2010 в 15.00** по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 14.04.2010 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*




Мінулая нядзеля запомніцца цяплом і кветкамі. Гэта была сапраўдная ўсмешка вясны. Сталіца квітнела. Адразу некалькі канфесій адзначалі Вербную нядзелю. Дарогі да храмаў нагадвалі каляровыя серпанціны. На плошчы Свабоды, дзе побач узвышаюцца галоўныя праваслаўная і каталіцкая святыні, адбываўся сапраўдны кветкавы баль — пад званы з вежаў. Вербачкі ядналі людзей і нагадвалі, што толькі шчаслівыя могуць быць гэткімі прыгожымі і падобнымі. Не зважаючы на ўзросты, прафесіі і веравызнанне. З тысячаў твараў выбраць сюжэт для фота было надзвычай цяжка — усё прэтэндавала на гістарычную падзею. Калі народ разам, калі свята агульнае — лепшая з лепшых падзей!

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# «ЧОРНЫ ПАНЯДЗЕЛАК» У МАСКВЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## У Беларусі ўзмоцненыя меры бяспекі

Супрацоўнікі сталічнай міліцыі ў сувязі з трагічнымі падзеямі ў Маскве таксама перайшлі на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, калі на тэрыторыі сумежных дзяржаў адбываюцца падобныя здарэнні, такая практыка звычайная. Да таго ж, з учарашняга дня ў краіне праводзіцца чарговая спецыяльная аперацыя «Арсенал», накіраваная на забеспячэнне кантролю за абаротам зброі, папярэджанне злачынстваў з яго прымяненнем, спыненне фактаў крадзяжу зброі, боепрыпасаў, выбуховых прыстасаванняў, іх канфіскацыі з незаконнага абароту, што таксама мае на ўвазе павышэнне пільнасці праваахоўнікаў. У прыватнасці, увесь асабовы склад аддзела ўнутраных спраў па ахове Мінскага метрапалітэна, у тым ліку афіцэры, выведзеныя на лініі метро, міліцыя дзяжурыць там са спецыяльнымі сродкамі. Пад больш пільнай увагай апынуліся канцавыя і перасадачныя станцыі метрапалітэна. Супрацоўнікі міліцыі ўважліва адсочваюць сітуацыю з падазроным багажом.

Што датычыцца пацярпелых ад тэрактаў у Маскве, то яны цяпер знаходзяцца ў розных бальніцах горада. Як зазначылі ўчора карэспандэнту нашай газеты ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў Беларусі, пакуль ніякіх звестак адносна таго, што сярод параненых былі і беларусы, няма.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# ПРЫГРЭЕ ДА 18, А Ў СЕРАДУ ДАЖДЖЫ З НАВАЛЬНІЦАМІ

На гэтым тыдні ў Беларусі чакаецца сапраўды цёплае, але дажджлівае надвор'е, калі сярэднясутачная тэмпература будзе на 5—10 градусаў вышэй за норму, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый Рабаў. У першай палове тыдня ў краіне будуць гаспадарыць паўднёва-заходнія вятры. Сёння паўсюдна пройдуць невялікія дажджы. Тэмпература 8—14, па поўдні да 17. У сераду ўначы невялікія дажджы ў паўночных раёнах. У апошні дзень сакавіка кароткачасовыя дажджы, месцамі з сур'ёзнымі навальніцамі чакаюцца па паўднёвым захадзе. Удзень магчыма ўзмацненне ветру месцамі парывамі да 15—18 м/с. Уначы 4—10, удзень 10—16, па паўднёвым захадзе — да 18. З чацвярга і на выхадныя характар надвор'я зменіцца: пахаладае, аднак сярэднясутачная тэмпература ўсё адно будзе вышэйшай за кліматычную норму. У чацвер, пятніцу і суботу на большасці тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы. У чацвер месцамі навальніцы. Уначы 3—10, удзень — 6—13. У пятніцу стане яшчэ халадней, калі тэмпература ўначы знізіцца да 0—плюс 7, удзень — 5—12. У суботу ўначы 0—6 цяпла, удзень — 3—10, па поўдні да 12 градусаў. У нядзелю атмасферны ціск стане павялічвацца, таму слабенькія кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі месцамі. Уначы — плюс 3—4, удзень — 6—13, па поўдні — да 15. Другая моцная хваля цяпла завітае ў нашу краіну ўжо ў другой дэкадзе красавіка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЦУКАР ЗНОЎ ПАДАРАЖЭЎ

З сённяшняга дня у сярэднім на 5 працэнтаў павышаныя фіксаваныя рознічныя цэны на цукар-пясок для рэалізацыі насельніцтву і мінімальная адпускная цана для рэалізацыі на прамысловую перапрацоўку.

Сёлета, нагадаем, гэта ўжо трэцяе павышэнне цэнаў на салодкі прадукт. У Мінэканомікі патлумачылі, што цяперашняе падаражэнне абумоўленае тым, што ў сумежных дзяржавах больш высокія рознічныя цэны на цукар-пясок, і зроблена з мэтай паляпшэння фінансавага стану цукраперапрацоўчых арганізацый. Рознічная цана на цукар-пясок вагавы цяпер складзе 2590 за кілаграм, на расфасаваны ў поліэтыленавыя ці папяровыя пакеты па 1 кілаграме — 2840 рублёў.

# БЕЛАРУСЬ АТРЫМАЕ 670 МЛН ДОЛАРАЎ

Савет Выканаўчых дырэктараў Міжнароднага валютнага фонду прыняў рашэнне аб выдзяленні нашай краіне заключнага пятага траншу крэдыту ў памеры каля 670 мільёнаў долараў ЗША, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацбанка Міхаіл Журавовіч. Такім чынам, агульны аб'ём выдзеленых МВФ Беларусі фінансавых рэсурсаў у рамках праграмы стэнд-бай складзе каля 3,46 мільярда долараў ЗША. Падчас пасяджэння Выканаўчыя дырэктары адзначылі значны прагрэс, дасягнуты Беларуссю ў рабоце па ўзнаўленні эканомікі пасля глабальнага крызісу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**ОАО «РЕСТОРАН «БЕЛАРУС»**
сообщает, что согласно решению
общего собрания акционеров от 26.03.2010 г.
**ОБЩЕСТВО ОСУЩЕСТВЛЯЕТ ВЫПЛАТУ ДИВИДЕНДОВ за 2009 г.**
**В ПЕРИОД с 30.03.2010 г. по 30.04.2010 г.**
Выплата дивидендов производится по адресу:
**г. Минск, ул. Сторожевская, 15 а.**
За дополнительной информацией обращаться **по тел. 293 17 17.**

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЗА 2009 ГОД

# ОАО «БРЕСТСКИЙ ЦЕНТРАЛЬНЫЙ УНИВЕРМАГ»

Количество акционеров всего – 367, в т.ч. юридических лиц – 9, физических лиц – 358.
Среднесписочная численность работающих (человек) – 604.
Основной вид деятельности – розничная торговля (ОКЭД 52120, ОКОНХ 71270).

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2010 года** (консолидированная отчетность)
млн руб.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 23 370 | 26 059 |
| амортизация | 102 | 6 402 | 7 779 |
| остаточная стоимость | 110 | 16 968 | 18 280 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 21 | 8 |
| амортизация | 112 | 15 | 3 |
| остаточная стоимость | 120 | 6 | 5 |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | | |
| амортизация | 122 | | |
| остаточная стоимость | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 112 | 171 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 30 | 35 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | 26 | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **17 112** | **18 456** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 12 522 | 12070 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 864 | 977 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | | |
| расходы на реализацию | 214 | 141 | 118 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 9 669 | 9 899 |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | 1 840 | 1 070 |
| прочие запасы и затраты | 219 | 8 | 6 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 1 628 | 1 046 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более, чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | 3 | |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | 2 | |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | 1 | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 658 | 600 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 515 | 486 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 27 | 10 |
| по налогам и сборам | 243 | | 23 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 1 | 1 |
| разных дебиторов | 245 | 108 | 79 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | 7 | 1 |
| Расчеты с учредителями | 250 | | |
| в том числе: по вкладам в Уставный фонд | 251 | | |
| прочие | 252 | | |
| Денежные средства | 260 | 410 | 435 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | | |
| Финансовые вложения | 270 | 159 | |
| Прочие оборотные активы | 280 | | 12 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **15380** | **14163** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **32492** | **32619** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 86 | 55 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | -1 |
| Резервный фонд | 420 | 274 | 258 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 41 | 41 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 233 | 217 |
| Добавочный фонд | 430 | 7 327 | 8 209 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | | |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 1283 | 869 |
| Целевое финансирование | 460 | | 5 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 315 | 1 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **9285** | **9396** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 3 601 | |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | 7 461 | 6 767 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **11 062** | **6 767** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 203 | 2 111 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 11942 | 14345 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 11269 | 13284 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 20 | 16 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 233 | 246 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | 1 | |
| по налогам и сборам | 625 | 158 | 329 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 56 | 60 |
| по лизинговым платежам | 627 | | |
| перед прочими кредиторами | 628 | 205 | 410 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | | |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | | |
| прочая задолженность | 632 | | |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **12145** | **16456** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **32492** | **32619** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2009 год** (консолидированная отчетность)
млн руб.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 59 954 | 57 868 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 9 189 | 9 526 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 50 765 | 48 342 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 40 025 | 37 547 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 10 740 | 10 795 |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | 10 602 | 10 130 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **138** | **665** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 2406 | 2316 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 388 | 284 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 2018 | 2032 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | | 640 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | 0 |
| доходы от операций с активами | 093 | 8 | 4 |
| прочие операционные доходы | 099 | 2010 | 1388 |
| Операционные расходы | 100 | 1209 | 797 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | | 1 |
| расходы от операций с активами | 102 | 13 | 4 |
| прочие операционные расходы | 109 | 1196 | 792 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **809** | **1235** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 63 | 65 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 1 | 2 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 62 | 63 |
| Внереализационные расходы | 150 | 104 | 526 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-42** | **-463** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **905** | **1437** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 74 | 465 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | 157 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **979** | **1745** |
| Налог на прибыль | 250 | 235 | 374 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 304 | 261 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | | 2 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **366** | **800** |
| Справочно (из строки 300): | | | |
| сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | |
| Прибыль (убыток) на акцию, руб. | 320 | 1 772 | 1 825 |
| Количество прибыльных организаций | 330 | 1 | 2 |
| сумма прибыли | | 648 | 800 |
| Количество убыточных организаций | 340 | | |
| сумма убытка | | | |
| Закрытие убытков за счет добавочного фонда при реорганизации предприятия в течение отчетного периода | 350 | 282 | |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) с учетом закрытия убытков в течение отчетного периода (300+350) | 360 | 648 | 800 |

**Информация о дивидендах, акциях, задолженности:**

| Наименование показателя | Ед. измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов | млн руб. | нет | нет |
| Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию (включая налоги) | млн руб. | нет | нет |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 25,678 | 20,461 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 8515 | нет |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 20 | 97 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | 493 | 478 |

По мнению аудиторской организации – индивидуального предпринимателя Могучей Н.Д. (лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0495695 от 06.03.2009, выданная Министерством финансов РБ), бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Брестский центральный универмаг», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение предприятия на 1 января 2010 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год.

**Руководитель** **Валюшицкий В.И.**

**Главный бухгалтер** **Шерешовец Л.Е.**

УНП 200019441

Организация:

# ОАО «ВИТЕБСКИЙ МЯСОКОМБИНАТ»

Учетный номер плательщика: УНП 300082579
Вид деятельности: **производство мясопродуктов**
Организационно-правовая форма: **открытое акционерное общество**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **210604, г. Витебск, Бешенковичское шоссе, 46**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 г.**

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | 110 | **40885** | **49304** |
| Нематериальные активы: | 120 | **16** | **15** |
| Доходные вложения в материальные ценности: | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | **3 986** | **5 261** |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **44 887** | **54 580** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | **30 831** | **35 420** |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | **1 709** | **2 425** |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | **2 528** | **4 245** |
| Расчеты с учредителями | 250 | | |
| Денежные средства | 260 | **1 973** | **1 276** |
| Финансовые вложения | 270 | **25** | **25** |
| Прочие оборотные активы | 280 | **218** | **218** |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **37 284** | **43 609** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **82 171** | **98 189** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | **14 572** | **14 572** |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | **372** | **372** |
| Добавочный фонд | 430 | **24 020** | **30 101** |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | **9 793** | **10 276** |
| Целевое финансирование | 460 | | |
| Доходы будущих периодов | 470 | **70** | **67** |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **48 827** | **55 388** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | **97** | **2 948** |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | **27** | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **124** | **2 948** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | **13 297** | **16 964** |
| Кредиторская задолженность | 620 | **17 751** | **21 425** |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | **384** | **357** |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | **1 788** | **1 107** |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **33 220** | **39 853** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **82 171** | **98 189** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**с 01 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.**

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **274 780** | **224 241** |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | **23 341** | **21 713** |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | **251 439** | **202 528** |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | **227 707** | **178 577** |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | **14 121** | **11 248** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | **9 611** | **12 703** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | **66** | **-18** |
| **III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | **601** | **238** |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | **601** | **238** |
| Внереализационные расходы | 150 | **1 875** | **1 973** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | **-1 274** | **-1 735** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | **8 403** | **10 950** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+/-210-220) | 240 | **8 403** | **10 950** |
| Налог на прибыль | 250 | **2 197** | **2 790** |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | **579** | **918** |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | | **5** |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | **5 627** | **7 237** |

**Информация о дивидендах и акциях, количестве акционеров ОАО «Витебский мясокомбинат»**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров ,всего | лиц | **3313** | **3250** |
| в том числе: юридических лиц | лиц | **5** | **5** |
| в том числе:физических лиц | лиц | **3308** | **3245** |
| Начислено на выплту дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | **338,012137** | **376,822031** |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (с налогом) | рублей | **248,19** | **276,68** |
| Обеспеченость акции имуществом Общества | тыс. руб | **40,6** | **35,8** |

# ПРЫЗ ДЛЯ АДДАНАЙ ПАДПІСЧЫЦЫ

**Жыхарка Хоцімска Любоў Аляксандраўна КОРЖЫЧ атрымала пыласос, які выйграла ў традыцыйным розыгрышы для падпісчыкаў «Звязды».**



**Начальнік Хоцімскага РВПС Надзея ПРАХАРЭНКА, падпісчыца «Звязды» Любоў Аляксандраўна КОРЖЫЧ і яе ўнук Аляксей.**

Любоў Аляксандраўна прыехала разам з мужам у Хоцімск амаль 35 гадоў таму і ўжо лічыць гарадскі пасёлак сваім родным. Жанчына працавала ў раённым аддзеле сацыяльнай абароны інспектарам па выплаце пенсій, а цяпер сама пенсіянерка. Увесь свой вольны час яна сёння прысвячае сям'і і гаспадарцы. На падворку Коржычы трымаюць двух парсючкоў, трусоў і курэй.

— Мы нармальна жывём, — расказала Любоў Аляксандраўна. — І самы мой вялікі клопат — гэта ўнукі. Малодшы вучыцца ў 3 класе, а старэйшы — у 8-м.

— Я рады, што бабуля выйграла каштоўны прыз, — падзяліўся старэйшы ўнук Аляксей, які прыйшоў разам з ёй на пошту. — Я і сам чытаю газету «Звязда»: усё мне цікава.

Любоў Аляксандраўна выпісвае «Звязду» 20 гадоў.

— Так, з 1990 года штоквартальна без перапынкаў, — пацвердзіла жанчына. — Мне падабаюцца ў газеце публікацыі пра здароўе, бо я ў іх знаходжу адказы на самыя актуальныя пытанні. Яшчэ я з'яўляюся шчырай прыхільніцай павучальных артыкулаў Янкі Крука. Абавязкова чытаю пра ўсе няшчасныя, а таксама і шчаслівыя выпадкі, якія здараюцца па ўсёй краіне.

Любоў Аляксандраўна дадала, што ёй падабаецца беларуская мова: «У нас тут на беларуска-расійскім памежжы — моўная мяшанка, аднак беларускую мову я добра разумею, таму што я — беларуска».

Яна прызналася, што вельмі рада падарунку. Пыласос, якім карысталіся ў хаце, вельмі стары, і яго месца цяпер зойме новы агрэгат. Аказваецца, за столькі гадоў Любоў Аляксандраўна толькі некалькі разоў сабралася перасланць картку падпісчыка на розыгрыш прызоў, і апошнім разам за гэтай справай прасачыў унук Аляксей. Вось неўзабаве і выйгралі бабуля з унукам пыласос!

— Ведаеце, я вашу газету буду выпісваць столькі, колькі буду жыць! — урачыста паабяцала Людміла Аляксандраўна Коржыч на пошце.

— «Звязда» мае ў нашым раёне адданых падпісчыкаў, — пракаментавала **начальнік Хоцімскага РВПС Надзея ПРАХАРЭНКА**. — У нас заўсёды тыраж гэтай газеты аднаўляецца. Людзі, якія выпісваюць газету, сапраўды адданыя «Звяздзе», беларускай мове і Беларусі.

— Мы зычым калектыву «Звязды» творчых поспехаў, здароўя і дабрабыту, — сказалі хоцімскія жанчыны. — Вялікі дзякуй за падарунак і ўвогуле, што даехалі да нас, бо Хоцімск сапраўды далёка ад сталіцы і вялікіх гарадоў. Мы тут цяпер чакаем сапраўднай вясны і хочам, каб нарэшце ўсё навокал зазелянела і заквітнела. І, вядома, заўсёды чакаем да сябе ў госці добрых людзей!

**Ілона ІВАНОВА.**

*Хоцімскі раён.*

Фотарэпартаж



# НЕЖАРТОЎНЫ НЁМАН



Пра сваю неўтаймаваную моц вясновы Нёман зноў нагадаў жыхарам Стоўбцаў і вёскі Новы Свержань. Вада затапіла цэлыя вуліцы, ператварыла двары ў сапраўдныя басейны, а да некаторых гаспадароў наведалася і ў жылыя памяшканні. Многія з пацярпелых памятаюць жудасную паводку 1979 года, крыху меншую ў 99-м, але і гэтую паводку перажываюць як вялікую трагедыю.

Асабліва цяжкія выпрабаванні выпалі на долю жыхароў Новасвержанскага Румовага завулка. Гледзячы, як хвалюецца мора вады, цяжка ўявіць, што па гэтай вуліцы яшчэ колькі дзён таму хадзілі бесклапотныя людзі і снаўдалі машыны. Цяпер там без рыбацкіх ботаў няма чаго рабіць (фота ўнізе). Пра жыццё вуліцы нагадваюць толькі сабакі, пакінутыя на ланцугах (сяброў, як правіла, ратуюць апошнімі). Найбольшая бяда прыйшла ў дом Ніны Ярашэвіч (фота ў цэнтры). Пяты дзень у яе хаце ледзь не па калена вады. Добра, што ёсць печ, дзе можна ратавацца ад холаду. Адчаю Ніны Іосіфаўны няма межаў, яна пытаецца ў кожнага, ці ёсць на свеце справядлівасць, ці можна спадзявацца на дапамогу ад дзяржавы. Многія з гэтага куточка паспелі хутка вывезці з падвор'яў жывёл у больш бяспечныя месцы, а Ніна Ярашэвіч да апошняга моманту трымалася за надзею, што яе свойская жывёла не пацерпіць. У нядзелю вада пачала пацiху адступаць і Ніна, нарэшце, з палёгкай уздыхнула.

Нямала давялося пахваляваца і Валерыю з Ганнай Базановым (фота ўверсе) з вуліцы Максіма Горкага. Гаспадарка ў іх — тры рагулі і дзясятак авечак. Жывёл спешна эвакуявалі. Без дапамогі супрацоўнікаў мясцовага МНС гэта было б куды складаней. Эвакуявалі нават стог сена. Некалькі дзяжурных лодак чакаюць каля вады з першай хвіліны паводкі. Гэты фотарэпартаж таксама зроблены не без дапамогі стаўбцоўскага раённага аддзялення пажарных выратавальнікаў.



Па зводках Гідраметцэнтра Рэспублікі Беларусь, узровень вады ў Нёмане ў раёне Стоўбцаў за апошнія суткі знізіўся болей чым на 15 сантыметраў. Але з вяртаннем ракі ў свае берагі жыццё пацярпелых жыхароў не так хутка вернецца ў свой звыклы і бестурботны стан.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

**Объявление,** опубликованное **в газете «Звязда» № 55 (26663) от 26 марта 2010 года** об утере печати Закрытого акционерного общества «Выставочный центр «Аквабел» Минский район, **считать недействительным**. Все **доверенности, выданные генеральным директором ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Синкевичем Николаем Николаевичем** на право подписи и получения материальных ценностей **с 23 марта 2010 года являются недействительными**. УНП 600438617

# МУЗЕЙНАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ ПАПОЎНІЛАСЯ

## паляўнічай стрэльбай XIX стагоддзя



**Супрацоўнікі дзяржбяспекі ў чарговы раз папоўнілі экспазіцыю Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Днямі начальнік УКДБ па Гродзенскай вобласці генерал-маёр Іван Корж перадаў у музей каштоўны экзэмпляр агнястрэльнай зброі XIX стагоддзя.**

Паводле інфармацыі прэс-службы УКДБ па Гродзенскай вобласці, у ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па барацьбе з незаконным абаротам зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў была атрымана інфармацыя аб намеры жыхара абласнога цэнтра прадаць паляўнічую стрэльбу XIX стагоддзя ў прыватную калекцыю грамадзяніна адной з заходнееўрапейскіх краін. Гродзенца схілілі да добраахвотнай выдачы зброі, якая ўяўляе гістарычную каштоўнасць.

Паводле заключэння спецыялістаў, гэтая паляўнічая двухствольная стрэльба 16-га калібру выраблена на Цірольскай зброевай фабрыцы Іагана Пецярлонга (Аўстра-Венгрыя, Інсбрук) у другой палове XIX стагоддзя.

Упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці неаднаразова вярталіся дзяржаве гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія затым перадаваліся ў розныя музеі нашай краіны экспертнай камісіяй Міністэрства культуры. У прыватнасці, у Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей перададзены праваслаўныя абразы, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама творы жывапісу, графікі, зброя. Найбольш каштоўныя экспанаты дэманструюцца ў музеі пастаянна, большая частка з іх прадстаўлена ў экспазіцыі «Выратаваныя каштоўнасці».

Пазалетась супрацоўнікі дзяржбяспекі вярнулі дзяржаве музейны экспанат — шахматную фігуру ладдзі XII стагоддзя, якая была ўкрадзена ў жніўні 2004 года. Яна лічыцца адным з сімвалаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея і ўпрыгожвае экспазіцыю старажытнасці і шматлікія буклеты.

**Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.**

Шануй сваё!

# КАВАЛАЧАК ПАЛЕСКАЙ БЕЛАРУСКАСЦІ

## у сядзібе Ніны ГЛАВАЦКАЙ



Не, такой банкетнай залы я дакладна не бачыла. Гэта памяшканне болей нагадвае этнаграфічны музей. Ручнікі, фартушкі, хусціны, абрусы, а яшчэ куфры, збанкі, процьма рознага посуду і ўсялякіх гаспадарчых дробязяў з навакольных вёсак Кобрыншчыны і суседніх раёнаў. Адзін ручнік вылучаецца сучаснай вышыўкай, і той Ніна Мікітаўна плануе замяніць, бо ён не ўпісваецца ў агульны стыль залы. Нават камін тут не проста камін, які дазваляе любавацца вясёлым вогнішчам падчас застолля. Камін пабудаваны разам з печкай-плітой. Такім чынам на агні можна варыць-смажыць, і падаваць з пылу, з жару прама на стол. Як сказала адна госця: «Першы раз я ў банкетнай зале, дзе пахне не цыгарэтамі ды хлоркай, а смажанымі скваркамі з цыбуляй». Такі пах, несумненна, пасуе да інтэр'еру гэтай залы. Нават свяцільнікі-жырандолі гаспадыня прыдумала сама, бо купіць тое, што падышло б, не надарылася. Сусед зрабіў металічныя каркасы, а сама яна некалькі вечароў абкручвала іх ніткамі з лёну. Атрымалася прыгожа і стылёва.

Зразумела, што сталы і лаўкі ў такой зале зробленыя з дрэва, але сучаснага. А вось куфры — старыя. Адзін з іх накрыты абрусам з дзівоснай вышыванкай — кветкі, птушачкі. «Гэта, — перахоплівае погляд Ніна Мікітаўна, — мне падарыла жанчына, якой цяпер 60 гадоў. Дык вось калі яна была маленькая, на нейкае свята разліла на абрус крыху топленага малака, знак застаўся, не адмываецца. А дакладна яна не памятае, ці маці вышывала абрус, ці, можа, яшчэ бабуля. А вось ручнік, якому, добра ведаю, больш за сто гадоў, вышыты на даматканым выбеленым палатне», — гаспадыня як спрактыкаваны экскурсавод вядзе далей па зале.

Тут адзначаюцца сямейныя святы, ну і мерапрыемствы па замовах. Гэтай вясной плануюць правесці першае вяселле ў беларускіх народных традыцыях. Сцэнар гаспадыня сядзібы распрацоўвае сама. Хвалюецца: першы раз, хочацца, каб атрымалася і весела, запамінальна, і разам з тым годна, павучальна, як было некалі на Палессі. Ніна Мікітаўна кажа, што апошнім часам здаралася быць на вяселлях, дзе нанятыя за немалыя грошы вядучыя апускаюцца амаль да пошласці, да нейкага тарабарскага прымітывізму. «Аднойчы такі гора-тамада ў ходзе доўгай забаўлянкі паставіў перад усёй залай дзяўчат побач з кавалерамі, на якіх засталіся з адзежы трусы і пінжакі. Гэта ўжо не вясельная забава, а нейкая іншая. Таму моладзь патрэбна вучыць на другіх прыкладах, вось і паспрабуем». У вёсцы Балата жыве жанчына, якая ведае мноства абрадавых песень тутэйшага краю. Трэба паехаць, запісаць, апрацаваць. Калі не паспеецца да першага вяселля, то абавязкова спатрэбіцца на наступныя мерапрыемствы, — разважае суразмоўніца.

У гаспадыні сядзібы «Палескія традыцыі» з вёскі Андронава Кобрынскага раёна задумак, ідэй, праектаў надзвычай шмат. І хоць сёлета яна была адзначана як пераможца рэспубліканскага конкурсу ў намінацыі «Захаванне беларускіх традыцый», гісторыя яе сядзібы па-сапраўднаму толькі пачынаецца. Сядзіба дабудоўваецца, добраўпарадкоўваецца.

Яшчэ некалькі гадоў таму Ніна Главацкая нават не думала не гадала пра новы статус свайго дома, пра турыстаў. Яна працавала як звычайны фермер. У іх з мужам 12 гектараў зямлі, дзе разбіты сад. На трох гектарах яны займаюцца ранняй агароднінай. Работы хапае. Але яна заўсёды была чалавекам творчым, любіла песні, танцы, любіла гатаваць і частаваць. І яе літаральна вылічыў кіраўнік Кобрынскага аддзялення Агрампрамбанка Сяргей Грыбок. Сяргей Аляксандравіч прыехаў і з дапамогай разлікаў, лічбаў, раскладак пераканаў яе, што яна павінна заняцца аграэкатурызмам. Расказаў, вядома, банкір пра ўмовы і парадак атрымання банкаўскай пазыкі. Яна літаральна загарэлася. Праўда, муж напачатку астудзіў пыл, сказаў нешта накшталт «родная, не варта спяшацца, трэба ўсё ўзважыць». Толькі іншымі словамі сказаў... Давялося сядаць разам, пралічваць, узважваць, думаць.

У выніку... з'явілася аграсядзіба «Палескія традыцыі». І закруцілася, панеслася. Яна цяпер ездзіць па вёсках, купляе старыя рэчы, што пыляцца на гарышчах пажылых людзей, бабулькі дастаюць з куфраў вышыванкі. Усё гэта патрабуе карпатлівай цяжкай работы па рэстаўрацыі, па давядзенні да ладу. Паездзіла, пагаварыла з людзьмі, пагартала адпаведную літаратуру, і раптам адчула, як усё гэта незваротна адыходзіць. Маладыя цяпер абстаўляюць дамы і кватэры ў вёсцы па-гарадскому: мэбля, посуд, бытавая тэхніка. Якія там дываны-ходнікі? І ў мінулае сыходзяць не толькі рэчы матуль, бабуль, але і лад жыцця палешукоў з яго разважлівасцю, памяркоўнасцю, чымсьці яшчэ такім, што словамі не выкажаш, але што дзіўным чынам было звязана з вось гэтымі рэчамі. «І так гэта ўсё пранікла ў душу, што захацелася хоць нешта зрабіць для захавання, сабой закрыць хоць кавалачак той брэшы, што ўтвараецца паміж мінулым і камп'ютарным будучым нашых унукаў», — кажа яна.

Цяпер Ніна Мікітаўна кроіць, шые, перашывае. Са старых навалачак робіць накідкі на падушкі. Бо ў яе сядзібе гасцявыя пакоі аформленыя ў народным стылі. У гасцявым дамку ложкі накрытыя вышытымі прасцінамі, стол — такім жа абрусам. У пакоі стаіць сапраўдная руская печ з ляжанкай. Некаторыя пытаюць, ці гэта не муляж. Печ сапраўдная, на ёй можна паляжаць і пагрэцца. Ну а побач з гэтымі спальнямі ў стылі фольк — цалкам сучасныя выгоды з гарачай вадой. У калідорчыку, які імітуе сенцы, стаіць мікрахвалёўка, чайнік на той выпадак, калі хто хоча сталавацца самастойна, а не замаўляць ежу ў гаспадароў. Такія госці бываюць. Але большая частка гасцей аддае перавагу яе фірмовым стравам. Не так даўно ў Андронаве гасцявала сямейная пара з Аўстраліі. Яны з'ехалі з радзімы 16 гадоў таму, родных тут не засталося. І раптам акунуліся ў сваю маладосць, у далёкае, роднае, так яны казалі самі на развітанне.

Андронаўская гаспадыня не толькі частуе сваіх наведвальнікаў, але і спявае, расказвае пра адметнасці Палесся і розных вёсак свайго раёна, што вельмі любяць госці. А яшчэ яны палюбілі фатаграфавацца ў нацыянальным адзенні. Для гэтага гаспадыня перашывае дзве сарочкі з набытых. Для дзяцей у яе прадугледжана шмат забаў. На невялікім возіку іх можна катаць. Асабліва малеча любіць маленькі калодзежны журавель. У мініяцюрны зруб памяшчаецца 15-літровае вядро вады, і малыя чэрпаюць з яго спецыяльным вядзерцам. Аднойчы ля гэтага калодзежа сышліся трое дзяцей з розных краін, ніхто не ведаў мовы іншага, але гулялі больш за дзве гадзіны, разумелі адно аднаго, чэрпалі ваду, «пяклі» пірагі з пяску. Любяць малыя і пакарміць курэй. Ну а калі хто з гасцей захоча замовіць сабе экскурсію ў Брэсцкую крэпасць, Белавежскую пушчу, на страусінавую ферму, гэта арганізуецца без праблем.



Але ж яе фішка — сваё, спрадвечнае. Менавіта ў Андронаве гасцей частуюць хатнім хлебам. Мама Ніны Марыя Архіпаўна і дачку навучыла хлеб пячы, і сама пакуль яшчэ дапамагае. Пірагі ў іх доме бываюць амаль кожны дзень, незалежна ад таго, ёсць госці ці не.

— Цяжка і крэдыт выплачваць, і асноўнай гаспадаркай займацца, і будоўлю заканчваць, — разважае Ніна Главацкая, — але я разумею, што гэта маё, я не адмоўлюся ад гэтага. Па-добраму зайздрошчу тым гаспадарам сядзібаў, якім многае падарыла прырода, у якіх пейзажы, ландшафты прама за акном. У нас жа дом пасярэдзіне вёскі, усё давялося рабіць на роўным месцы, кожны каменьчык прывезці, кожную дарожку вымасціць. Але люблю гэты шум і тлум, люблю, калі госці бываюць, люблю з імі пасядзець, паспяваць. Кожны раз прыдумваецца нешта новае, нават старэйшая ўнучка сказала аднойчы: «Ты, бабуля, прыдумшчыца». Так і ёсць. Прыдумшчыца-галава за дзень задае нагам такую работу, што ўвечары яны гудуць страшна. Але ж надыходзіць новы дзень і ўсё наноў, — смяецца суразмоўніца.



Надзвычай рада Ніна Мікітаўна таму, што яе ў яе новай справе дзеці падтрымліваюць. Старэйшыя сын і дачка жывуць сваімі сем'ямі, ды нярэдка наведваюць, сім-тым дапамагаюць. Малодшая Наталля вучыцца ва ўніверсітэце культуры. Яна — асаблівая матчына надзея: вернецца сюды спецыялістам — справа мусіць атрымаць новы размах.

* * *

Грамадскі савет па развіцці аграэкатурызму Брэстчыны працуе пры абласным аграпрамысловым саюзе. Як сказаў яго сакратар Мікалай Казак, у рэгіёне цяпер зарэгістравана каля 120 аграэкатурыстычных сядзібаў. Паводле яго слоў, «Палескія традыцыі» выдзяляюцца асаблівым уменнем прымаць гасцей менавіта ў палескай традыцыі. Сядзіба выклікае прыхільнасць усім разам: хатнім хлебам, смачнымі стравамі, добрымі песнямі. «Аднойчы на сядзібу завіталі два прафесары з Ізраіля, спецыялісты па турызме, якія праводзілі ў нашай краіне семінар. Не ведаю, што яны казалі свайму паслу, але пасол іх краіны потым патэлефанаваў мне і сказаў, што падчас свайго візіту на Брэстчыну ён хацеў бы спыніцца менавіта ў гэтай гаспадыні. Будзем чакаць візіту».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

### ДАМБУ АДНАВІЛІ, ПАРОМ ВЯРНУЛІ

У выніку пад'ёму вады на рацэ Прыпяць за 2 км на поўнач ад вёскі Запясочча Жыткавіцкага раёна сарвала з прычала паром, які належыць ААТ «Тураўшчына».

Каля гадзіны спатрэбілася выратавальнікам Пінскага цэнтра Рэспубліканскага атрада спецпрызначэння, які дыслацыраваўся ў раёне Жыткавічаў, каб знайсці паром і адбуксаваць яго на месца. Адначасова супрацоўнікам МНС давялося займацца аднаўленнем дамбы. Яе функцыі тут выконвае ўнутрыгаспадарчая дарога вышынёй 1,5 метра і шырынёй 2,5 метра, якую вада перамыла ў двух месцах. Для падсыпкі дамбы спатрэбілася 100 мяшкоў з пяском. Праз чатыры гадзіны пасля пачатку работ пагроза падтаплення 4 жылых дамоў, 30 гаспадарчых пабудоў і 50 га сельгасугоддзяў была прадухілена.

Увогуле ж у Жыткавіцкім раёне з-за пад'ёму ўзроўню вады ў рацэ Прыпяць зараз падтоплена 64 падворкі, у Петрыкаўскім вадой перамыты дзве аўтадарогі.

### 13 ПАРСЮЧКОЎ РАСТАЛІ Ў НАЧЫ

Жывёла знікла з хлява фермера, чыя гаспадарка знаходзіцца ў вёсцы Жураўлёўка Гомельскага раёна. Відаць, злодзей добра ведаў пра тое, што пабудова не мае ні агароджы, ні варты, а гаспадар жыве ў іншай вёсцы.

### ЗАХОЎВАЙЦЕ ГРОШЫ Ў БАНКУ

А не ў бляшанцы, як 76-гадовы жыхар вёскі Дварэц Рагачоўскага раёна. Да сталага чалавека наведаўся з нядобрымі намерамі грамадзянін з суседняй вёскі, які і выцягнуў усё багацце (а гэта 300 тысяч рублёў) з-пад падлогі, дзе бляшанка з грашыма была схаваная.

### НАЎРАД ЦІ ДОБРАЯ КАРДЫЯГРАМА

зараз ў злодзея, які ўдзень з аўтамабіля хуткай медыцынскай дапамогі на рабочай змене па Мазыры і Мазырскім раёне выкраў кардыёграф «Альтонік 06» коштам амаль 6 млн рублёў. Цікава, каму ён прадасць цяпер гэты прафесійны апарат?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### А НА ЗЯЦЯ І НЕ ПАДУМАЛА

Жанчына, якая жыве ў кватэры па вул. Тэльмана ў Баранавічах, не знайшла сваё золата — 8 ювелірных вырабаў на месцы не было. І тады гаспадыня звярнулася ў міліцыю.

Аператыўнікі злодзея доўга не шукалі. Золата ўкраў беспрацоўны зяць, які ўжо пабываў за крадзеж у калоніі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# МІЛЬЯРД ТУДЫ — МІЛЬЁН СЮДЫ

**Вялікая будоўля — прыцягальны аб'ект для розных арганізацый, фірмаў, асобаў. На такім аб'екце ёсць магчымасць развярнуцца. І разам з тым — даволі шырокае поле дзейнасці для розных махінацый і парушэнняў.**



Трэці месяц у Баранавічах працуе Лядовы палац і вось міжраённы камітэт Дзяржкантролю правёў праверку і ўстанавіў, што пры яго ўзвядзенні былі дапушчаны фінансавыя парушэнні.

Вядома, што ўзяць удзел у будоўлі Лядовага палаца хацелі многія фірмы, але, як кажуць, шмат ахвотных ды мала выбраных. Дзяржава зацікаўлена, каб падрадчык для выканання таго ці іншага заказу выбіраўся на конкурснай аснове. У каго лепшая прапанова, невысокая цана, той і атрымлівае заказ. Так павінна быць.

Але пры ўзвядзенні палаца быў некалькі іншы расклад. Вось на пастаўку вітражоў і алюмініевых вокнаў перамовы вяліся з фірмай «Баранавіцкія аконныя сістэмы», а іншыя прадпрыемствы апынуліся за бортам. Прадпрыемствы «Трайпл-Тэхна» і ААТ «Мантажлегмаш» гатовыя былі выканаць заказ па значна ніжэйшай цане, але ж узяць удзел у тэндары яны не змаглі. З «Баранавіцкімі аконнымі сістэмамі» пагаварылі, на іх і спыніліся.

Аднойчы прачытаў, што адна цяплічная гаспадарка ў сувязі з юбілеем аб'явіла тэндар на выданне альбома. Патэлефанаваў дырэктару і пацікавіўся, колькі чалавек захацела ўзяць удзел у тым конкурсе. Кіраўнік прадпрыемства, відавочна, палічыў, што я таксама хачу ўдзельнічаць у тэндары, і занепакоіўся: «У нас ўжо выбар зроблены і пытанне закрытае».

— Але ж па аб'яве тэндар яшчэ працягваецца.

— То па аб'яве...

А прыватнік выбіраў бы і перабіраў кандыдатаў, ды і ўвогуле такі альбом за свае грошы ён наўрад ці дадумаўся б выпусціць.

Напачатку «Баранавіцкія аконныя сістэмы» на вітражы ўстанавілі адну цану, а затым, падчас работы, кошт вітражоў вырас больш чым на 100 млн рублёў.

Пры гэтым фірма не закупляла камплектавыя часткі напрамую ў вытворцаў, а рабіла гэта праз ЗАТ «Аграбуд», якое з'яўляецца фундатарам «Баранавіцкіх аконных сістэм». Гэтыя фірмы цесна звязаныя між сабой і маюць адзін юрыдычны адрас.

Фірма па дакументах арандуе вытворчыя плошчы ў «Аграбуда». У перыяд будаўніцтва Лядовага палаца кошт арэнды вырас і быў уключаны ў накладныя расходы. Арэндная плата склала трэць выдаткаў.

Але пры ўзвядзенні палаца з негатыўнага боку засвяціліся і іншыя прадпрыемствы. У ААТ «Белсантэхмантаж-2» балансіровачны клапан па бухгалтарскім уліку меў кошт 2,4 млн рублёў, а ў акт выкананай работы была ўключана цана таго клапана ў паўтара раза вышэйшая. І ў выніку завышэнні дасягнулі 224 мільёнаў.

100 мільёнаў прыхапіў і генеральны падрадчык — будаўнічы трэст № 25, але не будзем стамляць чытача пералікам парушэнняў.

Узнікае пытанне да тых, хто павінен быў падчас будоўлі сачыць за расходам бюджэтных грошай, ажыццяўляць тэхнічны нагляд, бо Дзяржкантроль заняўся праверкай, калі Лядовы палац быў узведзены.

На гарадское ўпраўленне капітальнага будаўніцтва (УКБ), як заказчыка, былі ўскладзены функцыі кантролю за расходаваннем бюджэтных сродкаў, і за гэта яно атрымала больш за 1 млрд 300 млн рублёў. Але ці быў той кантроль эфектыўным?

Гэта не першы выпадак, калі мясцовыя УКБ дапускаюць хібы ў сваёй рабоце. Напрыклад, ляхавіцкія будаўнікі-кантралёры пусцілі на самацёк узвядзенне дамоў па дзяржаўнай праграме ў СВК «Жарабковічы», давялося прыкласці вялікія намаганні, каб выправіць брак. Магчыма, праблема ў тым, што УКБ падпарадкоўваецца мясцовай уладзе і хоча жыць спакойна.

Нехта спасылаецца на тое, што будаўніцтва Лядовага палаца вялося паралельна з праектаваннем, тэрміны падціскалі і вось як вынік — гэтыя парушэнні. Цікава. Няхай бы памыліліся не ў свой бок. Але ўсе чамусьці граблі пад сябе.

І вось горад прыступае да ўзвядзення Палаца водных відаў спорту, а праекта яшчэ няма. Хто сумняваецца, што палац будзе ўзведзены, але хацелася б, каб затым супрацоўнікі дзяржкантролю не шукалі незаконна прыхопленыя рознымі фірмамі грошы.

Нельга пагадзіцца з думкай, што выяўленыя парушэнні пры тых мільярдах, адпушчаных на будоўлю палаца, не такія ўжо і вялікія. Гэта як ў той прымаўцы: «Лес сякуць — шчэпкі ляцяць».

Праўда, можна ўвесь лес на шчэпкі пусціць, асабліва калі ён не твой.

Па выніках праверкі 22 службовыя асобы прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці, але хто будзе вяртаць тыя грошы дзяржаве? Падчас размовы з **начальнікам міжраённага камітэта дзяржкантролю Мікалаем ШВАЕМ** я спытаў пра гэта.

— *Матэрыялы праверкі накіраваныя ў праваахоўныя органы і ўсе незаконна ўзятыя грошы будуць вернуты дзяржаве. Для гэтага мы і працавалі.*

Хочацца, каб так і было.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

ЗВЯЗДА 30 сакавіка 2010 г.

# Ваўкавыск знішчаўся восем разоў...

**Выставу «Стары і новы Ваўкавыск» падрыхтаваў ураджэнец Ваўкавыска Віктар ВАЙТЧУК. Спадар Віктар — інжынер на чыгунцы, паралельна старшыня Ваўкавыскай гарадской арганізацыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў. Ён шчыра любіць свой горад, цікавіцца яго гісторыяй, збірае ўсе магчымая звесткі пра Ваўкавыск. Ягоная выстава ўжо экспанавалася два з палові месяцы ў Ваўкавыскім гарадскім ваенна-патрыятычным музеі, цяпер вось перабралася ў Раўбічы. А гэта ўзровень — бо раўбіцкі музей з'яўляецца філіялам Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Выстава працягнецца да 30 мая — кожны паспее. А пакуль мы гутарым з Віктарам Францішкавічам ВАЙТЧУКОМ.**

*(Заканчэнне на 10-й стар.)*



У Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах можна параўнаць Ваўкавыск 100 гадоў таму і цяпер

**Ёсць пытанне!**

## Што стане з касцёлам Св. Юзафа?

**Касцёл св. Юзафа не збіраюцца перадаваць Каталіцкай Царкве. Афіцыйную пазіцыю РУП «Мінская спадчына» зачытаў на прэс-канферэнцыі архіепіскап Мінска-Магілёўскі мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.**

*Вытрымка з ліста:*

«Сусветная практыка рэканструкцыі і ўзнаўлення рэлігійных храмаў і культавых збудаванняў пацвярджае правільнасць прынятага рашэння аб стварэнні гасцінічнага комплексу (прыклады: гатэль для маладых у Англіі, размешчаны ў будынку былога кляштара кармелітаў; гасцініца класа «Люкс» у будынку былога езуіцкага кляштара XV ст. і інш.)».

— Будынак будзе рэканструяваны, яго плануецца прыстасаваць пад гасцінічны комплекс, — працягвае каталіцкі іерарх. — Я напісаў ліст, дзе выказаў свой непакой і ўстрывожанасць сітуацыяй. Некалькі дзён таму я атрымаў адказ, падпісаны спадаром Шыкунцом, дырэктарам «Мінскай спадчыны». Прызнаюся шчыра, я не задаволены гэтым лістом — там няма адказаў на пастаўленыя мной пытанні. Шмат гаворыцца аб праведзеных спатканнях і сустрэчах, сімпозіумах, дзе гэтую праблему разглядалі, але нас — зацікаўлены бок — туды ніхто ніколі не запрашаў. Важна зразумець, што гэта будзе не толькі рэстаўрацыя, але таксама і рэканструкцыя, пасля якой вы не пазнаеце будынак храма. Сёння, калі ўвесь свет так моцна клапоціцца пра тое, каб захаваць спадчыну, «Мінская спадчына», якая павінна захоўваць спадчыну, яе фактычна разбурае (перапрашаю за рэзкасць). Спадчына павінна захоўваць спадчыну. Бо што ж мы перададзім новаму пакаленню?

Комплекс касцёла і кляштара бернардзінцаў заснаваны па фундацыі братоў Кансоўскіх. Пад касцёлам у крыпце ў свой час былі пахаваныя прадстаўнікі вядомых шляхецкіх і магнацкіх родаў: Завішы, Кансоўскія, Тышкевічы. У пачатку XIX ст. інтэр'ер касцёла ўпрыгожвалі 9 каменных, атынкаваных і аздобленых гіпсавай лепкай алтароў, якія да сёння не захаваліся. У 1864-м касцёл прыстасавалі пад праваслаўную царкву Св. Кірыла і Мяфодзія, кляштар — пад казармы Каломенскага пяхотнага палка і следчую камісію. Сёння ў будынку былога касцёла размешчаны Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі і Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

— Ёсць выпадкі, калі каталіцкая царква не выкарыстоўвае свае будынкі, — працягвае мітрапаліт. — У такім выпадку яна можа іх прадаць альбо падарыць: напрыклад, на Захадзе вядомыя выпадкі, калі шмат каталіцкіх храмаў каталіцкая царква передала праваслаўным вернікам. Але тыя храмы былі перададзеныя, а касцёл Св. Юзафа быў проста канфіскаваны. Гэта зусім іншая сітуацыя.

Касцёл бернардзінцаў — на сёння адзін з самых старых будынкаў у Мінску. Храм быў пабудаваны ў сярэдзіне XVII ст. Побач з ім размешчаны праваслаўны сабор Св. Духа.

**Ілья ЛАПАТО.**

**Ну і ну!**

### ВАДЗІЦЕЛЬ СКРАЎ... ПРЫДАРОЖНУЮ АЛЬТАНКУ

Прадстаўнікі адміністрацыі Віцебскага лясгасу паведамілі ў міліцыю пра тое, што нехта сярод дня скраў прыдарожную драўляную альтанку, якая стаяла на абочыне дарогі «Віцебск — Орша» ля вёскі Копці. Страту ацанілі ў больш за 2,3 мільёна рублёў. Злодзея знайшлі. Ім аказаўся 54-гадовы кіроўца. Супраць яго ўзбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПАДПАЛІЎ СУСЕДУ ДЗВЕРЫ

Чаго не падзялілі жыхары вёскі Вельямінавічы, што каля Брэста, зараз высвятляе следства. Але міліцыяй устаноўлена, што 21-гадовы жыхар гэтай вёскі ноччу падпаліў уваходныя дзверы на год старэйшаму жыхару. Узгаранне гаспадару ўдалося ліквідаваць самастойна. Страты ацэнены ў 50 тысяч рублёў.

**Яна СВЕТАВА.**


**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

— добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2 РН, 2 РП) **серия БИ №№ 0861708—0861710, 0873483.**

— добровольное страхование наземных транспортных средств (автокаско) 2 РН, 2 РП **серия АК №№ 0015647, 0023325.**

— квитанции 1 СУ **серия ГС №№ 5382666, 5384454, 5385994, 5386004, 5387750 и серия КС №№ 0276286, 0282871, 0285136.**


## ЯГОР РЫБАКОЎ ВЫЗВАЛЕНЫ ЎМОЎНА-ДАТЭРМІНОВА

**Былы кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Ягор Рыбакоў 19 сакавіка на падставе пастановы суда Шклоўскага раёна вызвалены ад далейшага адбывання пакарання ўмоўна-датэрмінова, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.**

Як удакладнілі ў міністэрстве, ён адбыў да месца пражывання ў Мінск. Нагадаем, што Ягор Рыбакоў быў асуджаны 11 лютага 2005 года Вярхоўным Судом па шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэкса да 11 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў тэрмінам на 5 гадоў. Асуджаны адбываў пакаранне ў папраўчай калоніі Шклова.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### РТУЦЬ НА ГАРЫШЧЫ

У закаркаванай бутэльцы з пад гарэлкі доўгі час захоўвалася ртуць агульнай вагой каля 500 грамаў. Вадкі метал знайшлі на гарышчы прыватнага дома ў Гомелі. Небяспечнае рэчыва перададзена супрацоўнікам МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


Минский городской центр недвижимости

**ООО «КАМЕНЬ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 30 АПРЕЛЯ 2010 ГОДА**

## ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже административного помещения с инвентарным номером 500/D-697247 общей площадью 408,7 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 56а, пом. 5**

Начальная цена – 642 960 000 белорусских рублей без учета НДС.

Шаг аукциона составляет пять процентов от начальной цены.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявку на участие в торгах; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); платежный документ, подтверждающий внесение задатка (с отметкой банка об исполнении); а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 60 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет ООО «Камень» № 3012000004939 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, код 742, УНП 101142344.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **30 апреля 2010 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 31.03.2010 по 27.04.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости», (017)255 75 82 – ООО «Камень».**



Минский городской центр недвижимости
